Вярбіцкая В.І.
БДУ культуры і мстацтваў, г. Мінск

# УНІВЕРСАЛЬНАЯ ІДЭЯ НАРОДНАЙ ПЕСНІ І ЯЕ ЎВАСАБЛЕННЕ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА

Калектыўная творчая дзейнасць этнаса з’яўляецца непадзельнай часткай яго духоўнай культуры. У ѐй зніто ўваецца ўсѐ лепшае, рацыянальнае і каштоўнае, што назапашана ў этнічнай культуры на працягу тысячагоддзяў. У вуснай паэтычнай творчасці, адлюстроўваецца працоўная дзейнасць, грамадскі і бытавы ўклад жыцця, культы і вераванні, рэалігійныя і сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці народа. ―Богат и разнообразен внутренний мир белорусского народа, пісаў Я. Колас у артыкуле ―Двадцать пять”. На протяжении своей истории он создал прекрасные образцы народного художественного творчества… Вся жизнь народа с его радостями и горестями, с его бытовым укладом, все его мировоззрение и его чаяния нашли свое отражение в этом творчестве” [5, с. 326]. Фальклор, як сінтэзаваная шматаспектная сфера ў культурнай самарэалізацыі і камунікацыі этнасаў, на думку народнага паэта Беларусі, уплывае на розныя аспекты онта-і філагенэза, уздейнічае на культурную кампетэнцыю суб’ектаў этнічнай культуры. Менавіта ў ім выяўляецца мадэль светабачання чалавека, фарміруецца нацыянальная самасвядомасць этнафора. У традыцыйнай вуснай паэтычнай творчасці адбываецца арыентацыя асобы на культурныя каштоўнасці. Пагэтаму ў мастацкай і публіцыстычнай творчасці Колас пастаянна звяртаўся да свайго фальклорнага вопыту і фальклорных запісаў як да своеасаблівых сродкаў інтэртэкстульнасці, арыентаваных на семантыка-стылістычныя асаблівасці тэксту, якія акрэслівалі спосабы выкарыстання фальклорных твораў ці іх фрагментаў у новых сувязях.

Шырока распаўсюджаным жанрам беларускай вуснай паэтычнай творчасці, які знайшоў адлюстраванне ў творчай спадчыне Я. Коласа, з’яўляецца песня. Творца лічыў, што адной з прымет этнічнай культуры з’яўляецца наяўнасць у этнаса спецыфічнай абраднасці і песеннасці, з уласцівымі ѐй вобразнымі мадэлямі асэнсавання свету, мастацкімі і жанравымі асаблівасцямі, адметнымі ладава-інтанацыйнымі характарыстыкамі. У беларускай народнай песні, па меркаванню Коласа, увасоблена сувязь мастацкай творчасці з законамі чалавечай псіхікі і з законамі светабудовы. Каляндарна-абрадавая паэзія адлюстроўвае распазнаваемую масавай свядомасцю заканамерную ўпарадкаванасць з’яў прыроды, у аснове якой – уяўленні аб пастаянным узнаўленні традыцыйнай формы. На думку народнага паэта Беларусі, універсальная ідэя народнай песні заключаецца ў імкненні захаваць род, сям’ю, забяспечыць працяг жыцця ў часе і прасторы. З гэтай кардынальнай ідэалагемы вынікаюць вытвораныя ад яе ідэі ўрадлівасці зямлі, ушанаванне продкаў, раслiннасці Яго ўражвалі традыцыйныя выразныя сродкі народнай песеннай семантыкі і сінтаксіса: метафары, эпітэты, сімвалы, псіхалагічныя паралелізмы. ―Кожная народная песня яму дарагая, пісаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М. Лужанін. І не ў сольным ці харавым выкананні праслаўленых майстроў, а так проста за сталом, калі спевакі не вызначаюцца ні галасамі, ні слыхам, а вядуць мелодыю, як загадае сэрца”[6, с. 193]. Добрае веданне Коласам песеннага фальклору спрыяла стварэнню ім сапраўднай паэтычнай санаты. Уплыў народнай песеннай традыцыі на паэта выказаны ім ва ўспамінах:”…А ўлюбѐная матчына песня расказвала пра нешчаслівае каханне, і галоўнаю асобаю быў Нѐман. Ні матыву, ні слоў успамянуць не магу, але яны недзе жывуць ва мне, і калі пачынаю ўяўляць нашу хату, маці пры рабоце, здаецца, чую і песню”[6, с. 26].

Я. Колас для паказу шырокай панарамы жыцця беларусаў, адметнасці нацыянальнага каларыту ўмела выкарыстоўваў багацце беларускай народнай песні. Так, для псіхалагічнага адлюстравання вясковай рэчаіснасці, ідэйна-мастацкіх поглядаў і каштоўнасцей беларуса у нашаніўскі перыяд Колас звяртаецца да народнай песні ў апавяданнях ―Соцкі падвѐў”, ”Сацыяліст”, ”Знайшли”, трылогіі ”На ростанях” і іншых. З песеннай скарбонкі ѐн браў сатырычныя песні, якія адметны вастрынѐй крытыкі негатыўных грамадскіх з’яў, высмейваннем людскіх заган. Так, каб больш дакладна намаляваць вобраз царскіх чыноўнікаў, пісьменнік абапіраецца на прыѐмы і сродкі народнай песеннай паэтыкі. У песнях, уведзеных у тэкст шэрагу мастацкіх твораў, адчуваецца гумар, іронія і сарказм, перабольшванне, гіпербалізацыя.

Эмацыянальнай узнѐсласцю і лексічна-вобразнай выразнасцю вылучаюцца святочныя беларускія песні, уведзеныя Коласам у паэтычныя і празаічныя творы. Паэт творча выкарыстоўвае шэраг народных песень і прыпевак у ―Новай зямлі”[3, с. 114-118], з іх дапамогай больш поўна раскрываецца ўнутраны свет сялян. Так, у раздзеле ―Надгляд пчол” перадаецца святочны настрой сям’і Міхаіла і яго сваякоў сродкамі народных песень, якія выконваюцца героямі паэмы з нагоды першага падгляда пчол. Кампазіцыя выконваемых песен будуецца на супрацьпастаўленні станоўчага і адмоўнага вобразаў, якія вынікаюць, перш за ўсѐ, з маральных якасцей этнафораў. Паэт выкарыстоўвае ў паэме і гульнявыя народныя песні, ў якіх выяўляюцца спаборніцтва выканаўцаў ў здольнасці да імправізацый, кемлівасці, спрытнасці. Вобразныя характарыстыкі спевакоў у паэме набываюць форму зачэпак, падражнівання, насмешлівага супрацьпастаўлення. Напрыклад, жанчыны-госці спяваюць песні-кпіны, у якіх раскрываюць у жартоўнай форме адмоўныя рысы мужчын, а апошнія ў адказ у песеннай форме падкрэсліваюць недахопы жанчын. Да таго ж песні суправаджаліся народна-бытавымі танцамі. У танцы як і ў песні абагульнена і тыпізавана самае шырокае кола з’яў і ўяўленняў аб акаляючай рэчаіснасці і ўнутраным духоўным свеце беларусаў. У паэмах ―Сымон-музыка”, ”Новая зямля” Коласам уводзіцца пазаабрадавы народны танец, які не дапасаваны да абрадаў каляндарнага і сямейна-родавага цыклаў. Такі танец выконваецца ў розных жыццѐвых сітуацыях, у любы час. У характэрнай для Коласа жартаўлівай манеры паказаны народныя танцы падчас ігрышча ў карчме (апвяданне ―Ігрышча”, паэма ―Сымон-музыка”), святочнага застолля ў сям’і лясніка. Апісаныя паэтам танцы вызначаюцца арганічнай сувяззю з ансамблевай і сольнай музыкай. У карчме дзецюкі і дзеўкі танцуюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

польку, вальс, ―каваля” пад акампанімент скрыпача Сымона, у апавяданні ―Ігрышча” народныя песні і танцы суправаджае музычны гурт. У творчай спадчыне Коласа ўвасоблены пластычныя ідэі народнага танца, які трывала замацаваны этнакультурнай традыцыяй.

Якубам Коласам таксама таленавіта распрацоўваліся розныя жанры народнай песні. У трылогіі ―На ростанях, паэме ―Новая зямля” ім апрацаваны і ўведзены ў тэкст духоўныя народныя песні, у якіх увасоблены сфарміраваныя этнічнай культурай беларусаў стэрэатыпныя спосабы ўяўлення і ацэнкі свету. Літаратурныя героі паэта спяваюць вялікодныя песні, у якіх услаўляецца боская прырода Хрыста, яго чалавечая сутнасць. Пры дапамозе духоўнай песні паэт імкнуўся ў экспрэсіўнай форме выразіць усю разнастайнасць чалавечых пачуццяў сваіх герояў. У валачобных песнях, якія спяваюць настаўнікі ў трылогіі ―На ростанях”, рэлігія ўспрымаецца не ў сваім артадаксальным статусе, а ў якасці ―абыдзеннай веры”. Настаўнікамі ўласныя хрысціянскія дагматы своеасабліва інтэрпрэціраваны ў адпаведнасці з ментальнасцю беларусаў[4].

Аналіз коласаўскіх паэтычных твораў дае падставы сцвярджаць, што з народнай песні выраслі многія геніяльныя творы санатна-цыклічнай формы. Дамінантныя вобразы, матывы, лад і мелодыя, уласцівая народнай песні, выразна прасочваецца ў вершах, якія склалі зборнік ―Песні жальбы”. У іх адчуваюцца пераважна самотныя, мінорныя спевы, якія вынікаюць з кантрастнай эстэтычнай ацэнкі рэаліяў сялянскага жыцця ў пачатку дваццатага стагоддзя. Праўда у гэтым жа зборніку маецца шэраг узнёслых песняў, якія славяць прыгажосць роднага краю. Вершам з цыкла ―Песні жальбы” кантрасна супрацьпастаўляецца лірыка-эпічная паэма ―Новая зямля”, дзе гучыць своеасаблівая аптымістычная сімфонія ў гонар красы беларускай зямлі.

Традыцыйнае музычна-моўнае вершаскладанне выразна адчуваецца ў значнай колькасці вершаў Я. Коласа, пакладзеных на музыку беларускімі кампазітарамі. Даследаванне музычнай спадчыны нашай краіны паказвае, што на аснове шэрагу коласавых вершаў беларускімі кампазітарамі Л.М. Абелевічам [1], А.Е. Туранковым [1], П.П. Падкавыравым [1], С.В. Палонскім [1], Г.К. Пукстам [1], Н.Н. Чуркіным [1] створаны цыкл песен. Па матывах паэмы ―Новая зямля” Ю.В. Семяняка стварыў оперу, лібрэта для якой напісаў вядомы беларускі драматург А.А. Петрашкевіч[1].

Аналіз рэпертуару музычных гуртоў ―Песняры”, ―Сябры”, Беларускага дзяржаўнага хору імя Г.І. Цітовіча і шэрагу іншых музычных калектываў сведчыць: песні на вершы Я. Коласа стала ўвайшлі у сённяшні іх рэпертуар.

Дзякаючы намаганням Я. Коласа, у 1940 годзе пабачыў свет першы том шматтомнага акадэмічнага выдання ―Песні беларускага народа”.

Такім чынам, даследванне паэтычных і празаічных коласаўскіх твораў дае падставу сцвярджаць, што творчая спадчына Коласа грунтуецца на вуснай народнай творчасці, маўленні беларускага этнаса, прыгажосці, рознабаковым глыбінным яе багацці і гнуткасці. У яго творчасці багацце і сіла народнай песні, яе ўніверсальная ідэя раскрылася ва ўсёй веліччы і глыбіні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура


1. Беларускі дзяржаўны архі-музей літаратуры і мастацтва.– Ф. 10. – Воп. 1, лл. 1-68; Ф. 30. – Воп. 1, лл. 1-9; Ф. 123. – Воп. 1, лл. 1-4; Ф. 198. – Воп. 1, д. 3-6; Ф. 206. – Воп. 1. – Спр. 101, лл.1-7; Ф. 345. – Воп. 1. – Спр. 69, лл. 14-17.

2. Колас, Я. Збор. твораў: у 14 т. Том 3. Апавяданні вершам, вершы, вершаваныя казкі, паэмы для дзяцей і народныя казкі ў апрацоўцы Я. Коласа / Я. Колас. – Мн.: " Маст. літ.", 1973.– 408 с. з іл.

3. Колас, Я. Збор твораў: у 14 т. Том 6. Паэмы ―Новая зямля, ―Сымон-музыка ―/ Я. Колас. – Мн.: " Маст. літ.", 1974. – 624 с. з іл.

4. Колас, Я. Збор твораў у чатырнаццаці тамах. Том 9. Трылогія ―На ростанях" / Я. Колас. —Мн.: ―Маст. літ.", 1975.—800 с. з іл.

5. Колас, Я. Збор твораў у чатырнаццаці тамах. Том 11. Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1917—1946 гг. / Я. Колас. —Мн.: ―Маст. літ.", 1976.—424 с. 8 с. укл.

6. Лужанін, М. Збор твораў у трох тамах. Том трэці. Колас расказвае пра сябе. Накіды партрэтаў / М. Лужанін.—Мінск: ―Беларусь", 1970.—528 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ